**Шукай, каб было меней “белых плямаў”**

Шаснаццаць гадоў майго жыцця прайшло ў найпрыгажэйшым куточку Беларусі, у пасёлку Касцюкоўка, што знаходзіцца каля самага Гомеля. Я вельмі люблю гэтае мястэчка і адчуваю сябе тут утульна і спакойна. Шырокія галіны-далоні магутных каштанаў паміж школай і плошчай заўсёды лагодна ахінаюць мяне сваёй зелянінай, задуменна шапаціць парк, магутнай птушкай уздымаецца ў неба царква. Подых часу тут адчуваецца.

Мае знаёмыя, калі даведваюцца, што я з Касцюкоўкі, дык смяюцца і кажуць: “ Там што Касцюкі жывуць?” А калі і задумваемся, чаму такія назвы, рэдка калі можам патлумачыць сур’ёзна. На дапамогу прыходзяць кнігі гісторыкаў, этнографаў. Я пачала чытаць навукова-папулярную літаратуру, этнаграфічныя выданні і пра многае даведалася, што крыніцай з’яўляецца ўжо апрацаваная доктарам філалагічных навук А.М.Ненадаўцам кніга легендаў і паданняў, звязаных з паходжаннем назваў 131 населенага пункта Гомельскай вобласці. Кніга ”Гомельшчына ў легендах і паданнях” адрасавана тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, духоўнай культурай беларускага народа.

Паданне пра Касцюкоўку тапанімічнае. Праз імя даецца тлумачэнне пра паходжанне паселішча. Ва ўсякім разе паданне, як сведчаць помнікі гісторыі, было вядома да прыезду ў Касцюкоўку барона фон Нолькена, які атрымаў маёнтак. У 1885 годзе яму за заслугі перад Расійскай Імперыяй былі пажалаваны маёнткі ў Магілёўскай губерніі, у тым ліку і землі сучаснага паселішча Касцюкоўка.

У кнізе гісторыка і даследчыка  А.Ф. Рогалева “Ад Гамеюка да Гомеля” ёсць цікавы факт: “Усходняя частка Мясніцкай вуліцы ( ад Румянцавай вуліцы ў бок перакрыжавання сучасных вуліц Пушкіна і Білецкага) прыкладна з 60-80-х гадоў 19 стагоддзя стала называцца вуліцай барона Нолькена. Менавіта тут знаходзіліся дамы, якія належалі дваранину Станіславу Іванавічу барону Нолькену. Гэты вяльможа меў таксама фальварак Касцюкоўка каля

аднаіменнай вёскі Пакалюбічскай воласці Гомельскага павета (380 дзесяцін зямлі). 6 мая 1919 года вуліцу барона Нолькена пераіменавалі ў вуліцу Ланге.

Канкрэтнага падання пра тое, што заснавальнікам Касцюкоўкі з’яўляецца барон фон Нолькен, няма. Значыцца паданне пра Кацюкоўку датуецца прыблізна да 1885 года. Вось у кнізе маёй зямлячкі, якая таксама з’яўляецца выпускніцай нашай 13 школы Л.К. Фомчанка “ Яроміна. Гісторыя вёскі”, адзначаецца: “Фальварак Касцюкоўка Лібава-Роменскай чыгункі да 1901 (1903) года належаў двараніну барону фон Нолькену Станіславу Іванавічу”. Вельмі цікавым фактам з’яўляецца тое, што аўтарка кнігі ўзгадвае легенду, але ж пра Ярому: “Існуе другое паданне пра паходжанне Яроміна. Толькі тут, надварот, дваранін Ярома згуртаваў вакол сябе сялян, і з’явілася паселішча Яроміна. Побач з ім жыў яго брат Касцюк, і яго імем названа паселішча Касцюкоўка”. І вось А.Ф. Рогалеў у сваёй нататцы “Як пачыналіся Касцюкоўка і Бальшавік” у газеце “Гомельскія ведамасці” у рубрыцы “Мінулае” зазначае: “Назва Касцюкоўка ўзнікла ад прозвішча Касцюк. У вёсцы Яроміна намі запісана паданне, у якім расказваецца аб перасяленні ў раён Гомеля двух братоў- Касцюка і Яромы. Першы з іх заснаваў Касцюкоўку, а другі- вёску Яроміна”.

Неабходна падкрэсліць важную ролю, якую наогул адыграла паданне ў культурным і грамадскім жыцці Касцюкоўкі. Гэта відаць з таго, як шчодра карыстаюцца скарбамі вуснай народнай творчасці жыхары самога паселішча, выкарыстоўваючы ідэйны змест і мастацкія вартасці падання ў нататках газеты “Гомельскі шловар”, якая выходзіць у рэдакцыі “Гомельшкло”. Таксама папулярнасцю карыстаецца інтэрнетсайт Касцюкоўкі, асабліва яго гістарычная старонка пра паходжанне паселішча і маентак барона фон Нолькена.

Хто ведае, ці захаваецца мноства іншых легендаў, калі мы не будзем проста здзіўляцца, цікавіцца, задумвацца над тым, чаму і як прыйшлі ў наш свет назвы ў наваколлі, калі ад штуршка цікаўнасці не будзем гартаць кнігі.